# Старадубскі беларус

Бывае, калі я ўспамінаю часы юнацтва і сталення, часы сваёй працы ў сістэме беларускай рэстаўрацыі, я згадваю ўсмешку высокага танклявага мужчыны з чорнай, як смоль, барадой. Гэта быў Валерый Слюнчанка. Нарадзіўся ён у 1945 годзе ў горадзе Старадубе на Браншчыне (гэта наш этнічны абшар), але потым пераехаў з бацькамі ў Беларусь.

Пазнаёміліся мы з ім у 1976 годзе. Тады я скончыў кафедру археалогіі гістарычнага факультэта БДУ, атрымліваў Ленінскую стыпендыю ў сто савецкіх рублёў і меў першае месца на размеркаванні. Спачатку спадзяваўся застацца на роднай кафедры, аднак гэтае месца заняла адна прывабная жанчына, і мой лёс павярнуў мяне ў іншы бок. Паколькі я добра вучыўся, былі розныя цікавыя прапановы, напрыклад, кафедра і (аспірантура) навуковага камунізму, школа КДБ і бліскучая кар'ера ў спецслужбе, а таксама праца археолагам у спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных майстэрнях Міністэрства культуры БССР.

З дзяцінства марачы стаць археолагам і ўжо маючы адпаведную падрыхтоўку, я без ваганняў выбраў апошняе. З 1 ліпеня 1976 года, адмовіўшыся ад адпачынку, я быў залічаны ў штат навуковага праектнага бюро майстэрняў на пасаду навуковага супрацоўніка з акладам 135 рублёў. Тады і пазнаёміўся з адным з найлепшых тагачасных архітэктараў-рэстаўратараў Беларусі Валерыем Слюнчанкам.

Нашаму блізкаму знаёмству паспрыяла і маё мсціслаўскае паходжанне, бо Слюнчанка меў у маім родным горадзе аб'ект рэстаўрацыі — будынак былога кармеліцкага касцёла XVII–XVIII стагоддзяў з унікальнымі фрэскамі.

Але галоўным аб'ектам рэстаўрацыі, у які Валерый уклаў шмат гадоў працы, была Полацкая Сафія. Гэты помнік патрабаваў вялікіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

археалагічных даследаванняў, ды на той час у Беларусі быў толькі адзін чалавек, дасведчаны ў галіне мураванага дойлідства, — даследчык-археолаг МіхасьТкачоў. Аднак тэмаю яго даследаванняў была ваенная архітэктура, а Полацкую Сафію ён вывучаў толькі як храм, прыстасаваны да абароны ў XV–XVII стагоддзях.

Слюнчанку ж цікавіла ранняя гісторыя Сафіі, часы Усяслава Чарадзея і Еўфрасінні Полацкай. Таму для вывучэння сабора ў 1975 годзе быў запрошаны ленінградскі археолаг архітэктуры Валянцін Булкін.

Пачаўшы працаваць у майстэрнях, я зразумеў, што ў галіне архітэктуры нічога не ведаю і не магу нават адрозніць фасад ад партала. У БДУ я вывучаў лацінскую мову і антычную Грэцыю, гісторыю Японіі і Егіпта, але гісторыю архітэктуры Беларусі нам ніхто не выкладаў, а археалогія Беларусі сягала да так званага дамангольскага перыяду, гэта значыць да сярэдзіны XIII стагоддзя. Культурны пласт часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай ніхто тады не вывучаў, і яго даволі часта зразалі бульдозерам, каб хутчэй выйсці да эпохі славутай міфічнай «Старажытнарускай дзяржавы».

Высветліўшы, якога археолага атрымалі пасля размеркавання, кіраўнікі майстэрняў разам з Валерам Слюнчанкам камандзіравалі мяне на два месяцы ў Полацк, у экспедыцыю Булкіна, з адной мэтаю — каб я навучыўся археалагічна даследаваць помнікі архітэктуры.

Раскопкі Полацкай Сафіі праводзіліся як вакол помніка, так і ўсярэдзіне будынка пад падлогай XVIII–XIX стагоддзяў.



Археалагічныя даследаванні полацкага Сафійскага сабора. 1970-я гады

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Было высветлена, што таўшчыня культурнага пласта вакол храма сягала на глыбіню 2,4 м. Гэтыя дадзеныя дазволілі Валеру зрабіць унікальны праект — «Дзве Сафіі». Уверсе Сафія XVIII стагоддзя — помнік віленскага барока з арганам, як зала арганнай музыкі. Унізе, пад падлогай — старажытная Сафія XI стагоддзя — археалагічны музей, дзе можна пабачыць першапачатковыя муры і фрэскі. Дарэчы, мая першая справаздача пра раскопкі Сафіі, у якіх я браў непасрэдны ўдзел як памочнік Валянціна Булкіна, Слюнчанку спадабалася, і нашыя стасункі зрабіліся больш прыязнымі.

Трэба сказаць, што ўпершыню жывую беларускую мову, літаратурную і прыгожую, я пачуў менавіта на працы ў рэстаўрацыйных майстэрнях. Па-беларуску размаўлялі кіраўнік майстэрняў, галоўны архітэктар Сяргей Друшчыц, архітэктары Валянцін Калнін і Аляксандр Канаваленка, гісторык Людміла Трэпет, мастацтвазнаўца Элеанора Вецер і, вядома, Валерый Слюнчанка.

Часта гучала беларуская мова на семінарах, якія ладзіў для архітэктараў і рэстаўратараў Алег Хадыка. Валерый быў актыўным удзельнікам гэтых семінараў і часта выступаў апанентам Алега Хадыкі. Да Элеаноры Вецер нярэдка завітваў Зянон Пазняк. Потым на працу прыйшоў фатограф Вячаслаў Дубінка, а хімічную лабараторыю ўзначаліў Максім Скурко, сын паэта Максіма Танка. Такім чынам, рэстаўрацыйныя майстэрні сталі трывалым беларускім асяродкам.

Яны перажылі пагром 1973 года, калі ў Мінску актыўна пераследавалі і звальнялі з працы беларускамоўных патрыётаў. Хіба што крыху прыпынілася культурніцкая праца. Але ў 1976-м яна зноў разгарнулася і асабліва пашырылася на пачатку 1980-х.

Менавіта тады па просьбе Валерыя і я пачаў археалагічныя даследаванні кармеліцкага касцёла ў маім родным Мсціславе.

Трэба сказаць, што касцёл збудаваны ў гістарычнай частцы горада насупраць Замкавай гары, дзе спачатку быў умацаваны дзядзінец, а потым — вялікі драўляны замак. Здагадкі Слюнчанкі пра ўнікальнасць культурнага пласта на касцёльным падворку цалкам пацвердзіліся. Былі знойдзеныя рэшткі старажытнага пасада XII–XVIII стагоддзяў, асабліва шмат кафлі і шклянога посуду, залаты галандскі гульдэн XVII стагоддзя (проста каля сцяны касцёла), брацкія магілы абаронцаў Мсціслава, якія загінулі ад рук маскоўскіх нападнікаў улетку 1654 года.

Паралельна з раскопкамі ў касцёле працавала група мастакоў-рэстаўратараў пад кіраўніцтвам Уладзіміра Ракіцкага, прычым усе яны гаварылі па-беларуску.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Цікава, што летам 1971 года я паехаў вучыцца ў Мінск цалкам зрусіфікаваным падлеткам, а праз дзесяць гадоў вярнуўся ў родны горад у якасці загадчыка аддзела археалогіі рэстаўрацыйных майстэрняў Міністэрства культуры, які з 1980-га пачаў усю працоўную дакументацыю весці па-беларуску.

Калі напрыканцы 1980-х гадоў пачалося беларускае адраджэнне, рэстаўратары былі ў першых яго шэрагах. Яны бралі актыўны ўдзел у палітычным жыцці краіны, у выбарах у Вярхоўны Савет СССР у 1989 годзе, у Вярхоўны Савет БССР у 1990-м, у мясцовыя саветы. Сярод іх быў і Валерый Слюнчанка, старадубскі беларус, таленавіты архітэктар і мастацтвазнаўца. Ён напісаў некалькі грунтоўных артыкулаў з гісторыі беларускай архітэктуры, кніжкі, прысвечаныя Полацкай Сафіі і Барысаглебскай (Каложскай) царкве ў Гродне.

На жаль, гэты працавіты чалавек меў слабое сэрца, якое зусім не шкадаваў. Ён мог тыднямі займацца архітэктурнымі абмерамі, лазіць па рыштаваннях і шурфах, цягаць цяжкія насілкі з друзам на суботніках у сутарэннях Полацкай Сафіі. З раніцы да позняга вечара мог сядзець за планшэтам з архітэктурнымі праектамі і рэканструкцыямі. Ён перанёс цяжкую аперацыю на сэрцы, якую зрабілі ў Вільні, крыху ачуняў і зноў узяўся за працу.

Аднак сэрца не вытрымала, і ўлетку 1992-га Валерый адышоў у лепшы свет на 47-м годзе жыцця. Памяць пра яго, увасобленая ў адноўленым Полацкім Сафійскім саборы, застанецца назаўжды.

*Алег Трусаў,*
кандыдат гістарычных навук,
старшыня Таварыства беларускай мовы
імя Францішка Скарыны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ